*интернет* (31912 апеляцый у Нацыянальным корпусе рускай мовы (газетны корпус)) / *Internet* (275 апеляцый), *памперс* (55) / Pampers (4), *ксерокс* (90) / Xerox (55), айфон (102) / iPhone (59) і інш.

*Бібліяграфічныя спасылкі*


1. Гомельские ведомости [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://newsgomel.by/. – Дата доступа : 20.01.2019.
2. Горбач, В. А. Стратыфікацыя іншамоўнай лексікі ў СМІ (медыйныя працэсы ва ўзаемадзеянні з мовай рэкламы) / В. А. Горбач // Журналістыка-2011: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 13-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю БДУ, 8–9 сн. 2011 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 13. – Мінск : БДУ, 2011. – С. 192–194.
3. Зелянко, С. В. Журналісцкі тэкст у сітуацыі постмадэрна / С. В. Зелянко // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2007. – № 2. – С. 107–112.
4. Зелянко, С. В. Прыёмы рэпрэзентацыі неалагізмаў у журналісцкіх тэкстах (на матэрыяле выданняў Выдавецкага дома «Звязда») / С. В. Зелянко // Журналістыка-2018: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 20-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 15-16 ліст. 2018 г. / рэдкал.: В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2018. – С. 339–342.
5. Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.ruscorpora.ru/. – Дата доступа : 20.01.2019.
6. Digital in 2018 in Eastern Europe Part 2 – East [Electronic resource]. – Mode of access : https://www.slideshare.net/wearesocial/digital-in-2018-in-eastern-europe-part-2-east-86865266/. – Date of access : 20.01.2019.



**Наталля Зубчонак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*


## РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПРЭСА БЕЛАРУСІ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ РАКУРСЕ

У сістэме сродкаў масавай інфармацыі значнае месца належыць рэгіянальным медыя. Іх асаблівасць вызначаюць наступныя фактары: своеасаблівы лакальны кантэнт, які мае свайго пастаяннага спажыўца; іншая, больш высокая, ступень уплыву на масавую аўдыторыю пры абмеркаванні і вырашэнні праблемных пытанняў, абумоўленая дастаткова высокім узроўнем даверу грамадзян да мясцовага СМІ. Такім чынам, у сучасных умовах глабалізацыі інфармацыйнай прасторы каштоўнасць мясцовага друку яшчэ больш узрастае праз яго набліжанасць да мясцовага жыцця, праз актыўны ўдзел насельніцтва ў абмеркаванні грамадскіх праблем.

Паступальнаму развіццю рэгіянальнай медыяпрасторы ў сучасных умовах спрыяе комплекс дзяржаўных мерапрыемстваў і адпаведных нарматыўна-прававых актаў: Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг., Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г. і інш. Асаблівая ўвага з боку дзяржавы надаецца рэалізацыі рэгіянальнай палітыкі, асноўнай мэтай якой з'яўляецца стварэнне належных умоў жыццядзейнасці насельніцтва ў рэгіёнах. У дадзеным напрамку многае залежыць і ад эфектыўнай работы СМІ, у першую чаргу рэгіянальных, якія здольны забяспечыць эфектыўны дыялог улады з насельніцтвам.

У працэсе гістарычнага развіцця фарміраванне рэгіянальных СМІ адбывалася з улікам сацыяльна-культурных і геапалітычных абставін. Так, першыя рэгіянальныя перыядычныя выданні з'яўляюцца ва ўмовах адсутнасці дзяржаўнай і тэрытарыяльнай вызначанасці Беларусі: «Гродзенская газета» (1776–1783), «Гродзенскія ведамасці» (1792), «Авізы Гродзенскія» (1678).

Афіцыйнымі выданнямі Паўночна-Заходняга краю сталі ў 1838 г. «Губернские ведомости». Так, у чатырох беларускіх губернях (Гродзенскай, Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай) да 1917 г. выходзілі газеты, якія нават ва ўмовах жорсткай расійскай імперскай палітыкі распаўсюджвалі інфармацыю аб мясцовым жыцці. З 1863 г. у Мінску, Полацку, Магілёве і Гародні пачалі друкавацца «Епархиальные ведомости». Пасля рэвалюцыі 1905 г. значна павялічылася колькасць мясцовых перыядычных выданняў. У розных беларускіх гарадах пачалі выпускаць земскія, ліберальныя, партыйныя газеты.

Новы этап станаўлення рэгіянальнага друку на тэрыторыі Беларусі пачаўся пасля рэвалюцыі 1917 г. У губернскіх і павятовых гарадах, дзе бальшавікі стваралі мясцовыя саветы, быў арганізаваны выпуск спецыяльных газет – «Известий» рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх дэпутатаў («Известия Военно-революционного комитета города Витебска», Известия Гомельского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов», «Известия Могилевского губернского исполнительного комитета Советов крестьянских, солдатских и рабочих депутатов»). На іх базе пазней былі створаны многія акруговыя, а потым раённыя і абласныя выданні.

У 1924 г. тэрыторыя Беларусі была падзелена на 10 акруг (Аршанская, Бабруйская, Барысаўская, Віцебская, Калінінская, Магілёўская, Мазырская, Мінская, Полацкая, Слуцкая). У перыяд 1924–1930 гг. у

БССР функцыянавала 11 акруговых выданняў. Напрыклад, у 1925–1930 гг. газета «Беларуская вёска» (сёння «Сельская газета») выходзіла як выданне ЦК КП(б)Б і Мінскага акруговага камітэта КП(б)Б. Урадам была распрацавана спецыяльная праграма дзейнасці гэтых друкаваных органаў, якая прадугледжвала не толькі задачы напаўнення кантэнту, але і рэгламентавала парадак работы рэдакцыі (штат, структура і інш.). Мясцовыя беларускія газеты паступова выпрацоўвалі ўласную канцэпцыю дзейнасці.

У 1930 г. у БССР былі ліквідаваны акругі, тэрыторыя была падзелена на раёны. З 1931 г. на базе акруговых выданняў пачынае фарміравацца сетка раённых газет. К 1932 г. іх налічвалася 75, у 1938 – 92. Перыядычнасць вагалася ад 25 разоў у месяц да 3-х, фармат А2, аб'ём 2-4 паласы. Так, газеты «Бальшавік Барысаўшчыны» і «Камунар Магілёўшчыны» выходзілі 24–25 разоў у месяц. Фарміраванне сістэмы раённага друку завяршылася пасля далучэння да БССР тэрыторыі Заходняй Беларусі. Колькасць раённых газет у 1941 г. складала 118. Іх агульны тыраж – 411 тыс. экз.

У 1938 г. адбыўся падзел тэрыторыі Беларусі на вобласці. Да шэрагу раённых газет далучыліся абласныя. У 1941 г. у БССР налічвалася 9 абласных газет «Бальшавік Палесся» (Палеская вобласць), «Віцебскі рабочы» (Віцебская вобласць), «Вольная праца» (Беластоцкая вобласць), «Гомельская праўда» (Гомельская вобласць), «Заря» (Брэсцкая вобласць), «Камунар Магілёўшчыны» (Магілёўская вобласць), «Палеская праўда» (Пінская вобласць), «Сялянская газета» (Вілейская вобласць), «Чырвоная звязда» (Баранавіцкая вобласць).

У пасляваенны час сістэма рэгіянальных СМІ працягвала ўдасканальвацца, колькасць выданняў павялічвалася. Так, у пачатку 1945 г. у БССР ужо налічвалася 8 рэспубліканскіх, 11 абласных і 168 раённых газет. 1 лістапада 1950 г. выйшла абласная газета «Мінская праўда». У 1954 г. былі ліквідаваны 5 абласцей (Баранавіцкая, Бабруйская, Пінская, Палеская і Полацкая), у 1966 г. за кошт разбуйнення 36 раёнаў былі створаны ці адноўлены 17 новых.

Чарговыя змены ў дзейнасці рэгіянальных выданняў Беларусі адбыліся пасля распаду СССР і скасавання дзейнасці Камуністычнай партыі. Газеты змянілі заснавальніка, праз некаторы час многія з іх сталі выходзіць пад новымі назвамі.

Такім чынам, пераважная большасць сучасных раённых і абласных выданняў функцыянуе на базе савецкіх, у перыяд дзейнасці якіх была выпрацавана метадалогія, ўключала ў сябе і прынцыпы работы

з чытачамі, і асаблівасці падбору інфармацыі, і жанравы складнік, і многія іншыя фактары, якія дазвалялі зрабіць мясцовае выданне дастаткова папулярным сярод насельніцтва. Менавіта зараз узнікае неабходнасць звярнуцца да выдавецкага і журналісцкага вопыту папярэднікаў, пераасэнсаваць яго і максімальна выкарыстаць.

Сёння доля рэгіянальных СМІ ў агульнай колькасці друкаваных перыядычных выданняў Беларусі таксама даволі значная. Па дадзеных Міністэрства інфармацыі, на 1-е студзеня 2019 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 743 газеты, з іх 137 – рэгіянальныя. Моцным застаецца і патэнцыял рэгіянальных СМІ, які грунтуецца на вялікім вопыце, трывалых традыцыях і сапраўдных нацыянальных каштоўнасцях.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Говін, С. В. Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917): Вучэб.-метад. комплекс / С. В. Говін. – Мн. : БДУ, 2003. – 99 с.
2. Елизаров, С. А. Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919–1991 гг.) / С. А. Елизаров. – Гомель: Гомельский государственный технический университет, 2009. – 222 с.
3. Марцелев, С. В. Печать советской Белоруссии : Ист. очерк / С. В. Марцелев. – Мн. : Беларусь, 1967. – 510 с.
4. Прахарэня, М. В. Фарміраванне рэгіянальнай інфармацыйнай прасторы Беларусі / М. В. Прахарэня // Весн. Гродз. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2018. – Т. 8, № 1. – С. 34–43.
5. Слука, А. Г. Беларуская журналістыка (1918–1941 гг.) : вучэб.-метад. комплекс / А. Г. Слука, Н. А. Зубчонак. – Мінск : БДУ, 2015. – 191 с.

**Виктор Ивченков**
*Белорусский государственный университет (г.Минск, Беларусь)*

## РЕЧЕВАЯ КУЛЬТУРА РЕГИОНАЛЬНОЙ ГАЗЕТЫ (комментарий к употреблению морфологической формы *по приезде*)

Язык региональной прессы приобрел особенности, которые заключаются в 1) свободном выборе речевых средств и отказе от стереотипов, 2) изменении соотношения стандарта и экспрессии, 3) усилении образности (тропеичности) текстов, 4) придании медиаречи диалогического характера, 5) вербальной и невербальной маркированности, 6) размывании стилистических границ, 7) эллипсисе сильноуправляемого элемента и грамматической вариативности предложно-падежных конструкций и проч.